ма Усебел. федэрацыя пісьменнікаў і паэтаў, якая ставіла за мэту стварыць Усебел. пісьменніцкі саюз. Мелі свае статуты, ідэйна-творчыя праграмы, большасць — аддзяленні (філіі), нац. секцыі, друкаваныя органы. Аб'ядноўвалі пісьменнікаў, літаратуразнаўцаў і крытыкаў розных пакаленняў, маст. індывідуальнасцей, поглядаў і падрыхтоўкі. Нягледзячы на пасобныя, часам сур'ёзныя, памылкі і пралікі ў арганізацыйнай дзейнасці і творчай практыцы сваіх чл., большасць Л.а. адыгралі важную ролю ў распрацоўцы новай метадалогіі, засваенні вопыту рус. і сусв. л-ры, арыентацыі аўтараў на актуальныя тэмы грамадскага будаўніцтва, выпрацоўцы спосабаў і прыёмаў адлюстравання рэчаіснасці ў яе дыялектычным развіцці, выхаванні маладых талентаў, пашырэнні л-ры ў масы, наладжванні сувязей з л-рамі і Л.а. народаў свету. У пач. 1930-х гг. наспела неабходнасць аб'яднаць усіх пісьменнікаў, хто падтрымліваў платформу дзеючай улады і імкнуўся ўдзельнічаць у будаўніцтве грамадства, у адзіны саюз. У адпаведнасці з пастановамі Цэнтр. Камітэта Усесаюзнай камуніст. партыі (бальшавікоў) ад 23.4.1932 «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый» і Цэнтр. Камітэта Камуніст. партыі (бальшавікоў) Беларусі ад 27.5.1932 «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый БССР» створаны Аргкамітэт Саюза савецкіх пісьменнікаў Беларусі (у складзе адпаведнага ўсесаюзнага). Ён ажыццявіў падрыхтоўку да 1-га Усебел. з'езда пісьменнікаў (8—14.6.1934), які арганізацыйна аформіў *Саюз пісьменнікаў Беларусі* (СПБ) у складзе Саюза пісьменнікаў СССР (утвораны на 1-м Усесаюзным з'ездзе пісьменнікаў, 17.8—1.9.1934). У Зах. Беларусі ў 1933—34 нелегальна дзейнічала рэв. Л.а. Літ. фронт сялянска-рабочых пісьменнікаў, была створана арг-цыя «Веснаход».

У 1994 СПБ стаў Саюзам бел. пісьменнікаў (СБП). У 2005 група пісьменнікаў з СБП утварыла СПБ (старшыня М.Чаргінец) з мэтай садзейнічання ў напісанні твораў высокага маст. ўзроўню і развіцці форм, стыляў і жанраў бел. л-ры, дапамогі маладым пісьменнікам у творчым росце, пашырэння і паглыблення сувязей з замежнымі калегамі.

**ЛІТАРАТУ́РНЫЯ БАЛА́ДЫ**, ліра-эпічныя творы фантастычнага, гераічнага, гістарычнага ці сац.-быт. зместу з элементамі незвычайнага і драматычна-напружанага развіцця дзеяння. У бел. Л.б. адбіліся матывы фальклору, міфалогіі, балад, нац. фантастыкі. Гэтыя творы заключаюць шмат элементаў драматургіі: наяўнасць дзеючых асоб, рэтраспектыўны характар апавядання, дыялогі, сутыкненні чалавечых лёсаў, драматызм дзеяння. Звычайна ў Л.б. апавядаецца пра рэальны выпадак, пры гэтым герой застаецца безыменным, бо важны не столькі подзвіг канкрэтнага чалавека, колькі тое, што яго маглі здзейсніць многія людзі. Каб яскрава і ўсебакова паказаць канфлікт гал. героя з яго сац. асяроддзем, колькасць дзеючых асоб свядома абмяжоўваецца — звычайна не больш 2—3.

У 19 ст. на аснове фальклору напісаны балады «Свіцязянка» А.Міцкевіча, «Травіца брат-сястрыца» В.Дуніна-Марцінкевіча, «Хцівец і скарб на святога Яна» Ф.Багушэвіча, «Калдычэўскі шчупак», «Навагрудскі замак» Я.Чачота і інш. Нар. балада адыграла выключную ролю ў станаўленні Л.б. Я.Купалы («Над ракою ў спакою», «Братка і сястрыца», «Песня», «Забытая скрыпка» і інш.). Любоўная бел. балада носіць характар трагічнасці («Курган», «Рута» К.Буйло, «Белым кветам адзета каліна» М.Багдановіча). Шырока выкарыстоўвалі фалькл. элементы ў Л.б. перыяду Вял. Айч. вайны: Я.Колас («Жураўліны вырай»), П.Броўка («Магіла байца»), М.Танк («Казак гнаў каня»), А.Куляшоў («Маці») і інш. У Л.б. 2-й пал. 20 ст. адчуваецца зварот аўтараў да першавытокаў далёкіх продкаў: «Паэма пра явар і каліну», «Раманс пра караля, што пакінуў трон» У.Караткевіча, «Каб не плакалі кані» А.Лойкі, «Веча славянскіх балад», «Лебядзіная вернасць» Я.Сіпакова, «Буслы» Н.Чарнушэвіча і інш.

*Літ.*: Ш т э й н е р І. Беларуская балада. Вытокі жанру і паэтычная структура. Мінск, 1989. Я г о ж. Балада: генезіс, эвалюцыя, перспектывы жанру. Мінск, 2003.

*А.М.Аляхновіч.*

**ЛІТАРАТУ́РНЫЯ ГУРТКІ́**, творчыя аб'яднанні літаратараў аднолькавых поглядаў, зацікаўленняў, кірункаў і інш. Да Л.г. належаць таксама розныя літ. салоны, «вечары». Адзін з першых у Беларусі Л.г. існаваў у Мінску ў 2-й пал. 18 ст. пры ваяводскай школе (гімназіі). У 19 ст. вядомы гурткі В.Дуніна-Марцінкевіча ў Мінску, А.Вярыгі-Дарэўскага ў Віцебску, Я.Баршчэўскага і Р.Падбярэскага ў Пецярбургу, А.Кіркора ў Вільні, студэнцка-вучнёўскія гурткі ў Горках і інш. Паводле характару дзейнасці да Л.г. блізкія многія т-вы, што ўзнікалі ў гарадах Беларусі ў канцы 19 — пач. 20 ст.: *Мінскае таварыства аматараў прыгожых мастацтваў*, *Мінскае літаратурна-артыстычнае таварыства*, Гомельскае муз.-драм. т-ва. У Пецярбургу дзейнічаў студэнцкі *Беларускі навукова-літаратурны гурток*. Л.г. ствараліся на прадпрыемствах, у вучэбных установах, пры бібліятэках, часопісах і газетах. Вялікая колькасць Л.г., якія садзейнічалі развіццю бел. л-ры, была арганізавана літ. аб'яднаннем *«Маладняк»*. У крас. 1934 у Мінску адбыўся Усебел. злёт літгурткоўцаў. На сучасным этапе многія бел. Л.г. ў рабоце спалучаюць традыцыйнае і новае. Сярод іх: літ. аб'яднанні пры газ. «Наш час» (г. Ваўкавыск), пры «Свіслацкай газеце» (г. Свіслач), «Натхненне» пры Магілёўскім дзярж. ун-це, «Парнас» пры Бел. с.-г. акадэміі (г. Горкі), «Пралеска» пры Гомельскай цэнтр. раённай б-цы і інш.

**ЛІТАРАТУ́РНЫЯ ДАДА́ТКІ**, перыядычныя і неперыядычныя выпускі літаратурна-мастацкіх матэрыялаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ